*В. Т. Багдановіч*
(Гродна)

**Відовішча як нетрадыцыйная форма работы**
**ў сучасным музеі**
(з вопыту работы ДУК
«Музей Максіма Багдановіча» ў Гродне)

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Наведванне музея для большасці людзей – гэта звычайна школьная экскурсія ці індывідуальнае наведванне экспазіцыі калі-нікалі; больш прыемныя ўражанні застаюцца пасля «турыстычнага» агляду. Такое становішча ўздымае пытанні новых падыходаў да музейнай аўдыторыі, ды і XXI ст. патрабуе гэтага. Маладое пакаленне, не адыходзячы ад экранаў камп'ютара, мае магчымасць знайсці амаль усю патрэбную інфармацыю праз тэлебачанне і Internet. Зразумела, што музейная пазіцыя «настаўнік – ахоўнік» даўно сябе зжыла.

Сёння музей – гэта шматфункцыянальная з'ява – не толькі навукова-асветніцкая, якая праводзіць пошук, збіранне, рэстаўрацыю, захаванне і экспанаванне гісторыка-культурных каштоўнасцей, але і складаная, шматузроўневая сістэма, што вырашае шэраг сацыяльна важных задач, сярод якіх – мастацкая арганізацыя вольнага часу, інтэграцыя пазнавальна-асветніцкай і забаўляльна-творчай функцый.

Шматлікія літаратурныя музеязнаўчыя крыніцы апісваюць вялікую колькасць форм культурна-адукацыйнай работы – ад лекцый да майстар-класаў, ад сюжэтна-гульнёвых форм да сінтэтычных фестываляў і свят. Усіх іх аб'ядноўвае адна значная складаючая – відовішча.

Тлумачальны слоўнік беларускай мовы падае тэрмін «відовішча» ў двух значэннях: 1. Тое, што паўстае перад вачамі, з'яўляецца прадметам агляду. 2. Тэатральнае альбо тэатралізаванае прадстаўленне [8].

Першае значэнне, здавалася б, поўнасцю падыходзіць пры асэнсаванні музейных экспазіцый, тым больш, што гэты пункт погляду абгрунтавана падтрымліваюць некаторыя музеязнаўцы [3]. Але ўсё ж існуе некалькі якасных характарыстык відовішча [1], якія адносяць нас да другога тлумачэння. Гэта вельмі трапна адлюстравана і ў слоўніку У. Даля – «событие, случай,

происшествие, видимое глазами…» [2]. Асновай усяго відовішча з’яўляецца дзейснасць існавання – не проста агляд, а падзеі і з’явы, якія адбываюцца «зараз і тут».

Праведзеныя даследаванні паказалі, што амаль 100 % рэспандэнтаў лічаць відовішча яскравай, узбуджаючай эмацыянальную сферу з’явай, якая адрозніваецца навізной і незвычайнасцю ў межах пэўнага асяроддзя [7]. Гэтыя крытэрыі не дазваляюць лічыць музейныя інсталяцыі (на ўзроўні з творамі мастакоў і скульптараў) відовішчамі.

Адной з распаўсюджаных форм відовішча з’яўляецца тэатралізаванае прадстаўленне, якое нараджае ў гледача эфект удзелу, суперажывання і сумеснай творчасці [6]. Тэатралізаванае прадстаўленне як культурна-адпачынкавае мерапрыемства выконвае тыя ж сацыяльна-культурныя функцыі, што і музей: выхаваўча-адукацыйную, камунікатыўную і адпачынкавую. Тым больш што з павышэннем ролі музеяў у арганізацыі вольнага часу праявілася тэндэнцыя ствараць прывабныя для аўдыторыі формы – ад выкарыстання аўдыявізуальнага суправаджэння да канцэртнага і святочна-тэатралізаванага прыёмаў [9].

З даследаваннямі Дункана Ф. Камерона і яго паслядоўнікаў звязваецца новы падыход да музейнай камунікацыі, якая больш наблізана да паняцця камунікацыі ў відовішчы; пры ім наведвальнікі выступаюць у якасці паўнапраўнага ўдзельніка працэсу, а не пасіўнага ўспрымальніка ведаў [9].

Да базавых форм работы ў музеі, акрамя экскурсій, лекцый і кансультацый, адносяцца літаратурныя пасяджэнні, гульнёвыя формы, тэатралізаваныя прадстаўленні, святы, майстар-класы і інш. [5].

Вядома, што новая інфармацыя чалавекам лепш успрымаецца ў працэсе актыўнай дзейнасці – на гэтым пабудаваны заняткі дашкольных і малодшых школьных устаноў, інтэрактыўныя курсы для дарослых. Людзі запамінаюць прыблізна 20 % з таго, што пасіўна назіраюць, і амаль 90 % з таго, што самі ствараюць. Можна зрабіць вывад, што да 50% новай інфармацыі, якую распавядае нам экскурсавод, страчваецца ў прасторы. Сітуацыя суперажывання пераўтварае наведвальніка з пасіўнага аб’екта ў актыўнага ўдзельніка музейнай камунікацыі, а гэта спрыяе больш поўнаму ўспрыманню фактычнага матэрыялу.

РЭПОЗІТОРЫЙ БГУКІ

Н. В. Нагорскі, вывучаючы інтэграцыю відовішча ў музейную экспазіцыю, слушна заўважае, што на практыцы ўключэнне мастацкай вобразнасці пры пабудове экспазіцыі мае даволі шырокі дыяпазон – ад унясення асобных выразных сродкаў афармлення, якія павялічваюць эмацыянальнае ўспрыманне аб'ектнага асяроддзя, да вобразна-сюжэтнага метаду на аснове сцэнарных распрацовак, што прадугледжваюць як навуковую, так і мастацкую канцэпцыю прадстаўляемага матэрыялу [4]. Выкарыстоўваючы гэтыя веды, шмат нетрадыцыйных форм ужо апрабаваны ў ДУК «Гродзенскі музей Максіма Багдановіча»*.

Пры музеі працуе салон маладых літаратаў «CREDO», у межах якога праводзяцца літаратурныя вечары-чытанні аўтарскіх твораў і твораў беларускіх класікаў, конкурсы вершаў. Гэтая форма дазваляе «выхаваць» сваю аўдыторыю, прывабіць творчую моладзь, звярнуць увагу на стан адпачынку сярод школьнікаў і студэнцтва. Відовішчнасць праяўляецца тут у нетрадыцыйнасці саміх салонных сустрэч. Яны, як правіла, тэатралізаваны пры дапамозе касцюмаў і бутафорыі, тэматычна абгрунтаваны зваротам да кола з'яў і пытанняў, блізкіх дому Максіма Багдановіча.

Рэгулярна праводзяцца тэматычныя салоны па вывучэнні звычак, забаў, спосабаў правядзення вольнага часу еўрапейскай інтэлігенцыі XIX ст. Праводзяцца майстар-класы па запаўненні салонных альбомаў, этыкету, вывучэнні мовы кветак, выцінанцы, традыцыйнымі сталі гульні ў салонныя фанты. Гэтыя формы па змесце набліжаюцца да гістарычнай рэканструкцыі, але носяць больш забаўляльны, чым навукова-гістарычны, характар. Пры гэтым выкарыстанне дадзеных форм спрыяе стварэнню «сітуацыі мастацкай самадзейнасці», якая, у сваю чаргу, фарміруе педагагічнае ўздзеянне на калектыў і асобу.

Найбольш метадычна распрацаванай з'яўляецца форма тэатралізаванай экскурсіі. З 2011 г. у музеі сістэматычна праводзіцца тэатралізаваная экскурсія «Марыя Апанасаўна запрашае». Наведвальнікі нібы пераносяцца ў часе і акунаюцца ў атмасферу XIX ст.; становяцца на пазіцыю ўдзельнікаў, бо яны – рэальныя госці гаспадыні дома, якая праводзіць іх па сваіх пакоях, знаёміць са сваім бытам і жыццём. Гэта не проста назіранне, а «ўваход» у асяроддзе. Падчас гасцявання да Марыі Апанасаўны прыходзіць яе

* Тут і далей разглядаюцца тэарэтычныя аспекты з крыніцы № 4 (калі не пазначана іншага).

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

сяброўка. Наведвальнікі становяцца не толькі сведкамі сустрэчы, але і ператвараюцца ў «прымаючы бок»: вітаюць госцю, падтрымліваюць свецкую размову – актыўна жывуць у прапанаваных абставінах.

Захапляльная, арыгінальная і разам з тым духоўна насычаная форма стымулюе цікавасць да музея, павялічвае колькасць яе наведвальнікаў. Выконваецца адна з найважнейшых музейных функцый – першапачатковы імпульс да паступовага самаразвіцця, ад адпачынку да больш высокага ўзроўню – пазнання.

Зразумела, што пры выкарыстанні любых форм і метадаў работы з музейнай публікай нязменным і інварыянтным элементам функцыянавання музея з'яўляецца экспанат. Менавіта праз яго транслiруюцца ўсе вобразныя і мастацкія напрамкі ўздзеяння на аўдыторыю. Ствараецца асобны – музейны – вобраз [4].

Экспанат – дакумент, мемарыяльная дастовернасць, першакрыніца інфармацыі, пазбаўленая тэатральнай творчасці. Пры мастацкім асэнсаванні ён можа з'яўляцца як ядром дзеяння, так і ілюстрацыяй да яго, аб'ектам творчай інтэрпрэтацыі рэальнасці. Менавіта таму экспанат дапамагае творцу знаходзіць мастацкае асэнсаванне ў канве сюжэтнай гісторыі.

Так, пры перадачы культурна-гістарычнага вобраза старажытнага інструмента сярэдзіны XIX ст. – «фісгармоніі» ў музеі Максіма Багдановіча ён выкарыстоўваецца не толькі як аўдыятранслятар, але і для жывой ігры, са зваротам да арыгінальных нотных зборнікаў, выпісаных гаспадыняй дома. Гучаць тагачасныя салонныя танцы «Па зефір» і «Пахіта». Экспанат становіцца актыўным дзеячам тэатралізаванага прадстаўлення, своеасаблівай машынай часу, якая пераносіць публіку XXI ст. больш чым на 100 гадоў назад.

Падчас такой экскурсіі ўзмацняецца сацыяльна-педагагічнае ўздзеянне на асобу, павялічваюцца камунікатыўныя магчымасці музея, раскрываецца яго сэнсавы і сутнасны змест праз яркую відовішчнасць і тэатральнасць.

Адным з дзейсных метадаў прыцягнення ўвагі і пазнання музейных экспанатаў з'яўляецца гульня. Сучасную моладзь цяжка прывабіць абы-якой гульнёй. Разбэшчаная Internetам, яна патрабуе ў рэальным жыцці не менш захапляльных форм. Робячы стаўку на азарт і канкурэнцыю, жаданне паспрабаваць усё «на зуб» і «пабадзяцца» па прасторах, у музеі выкарыстана знаёмая і блізкая

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ім форма «квэст», перанесеная з віртуальнай рэчаіснасці ў рэальную прастору.

Квэст – гульня, якая мае назву «Башня міру» (па матывах казкі М. Багдановіча), складаецца з некалькіх этапаў, якія адпраўляюць маладых даследчыкаў па экспазіцыйных залах: у розныя часы жыцця і творчасці М. Багдановіча. Падчас гульні яны разгадваюць загадкі, выконваюць заданні практычнай накіраванасці, спаборнічаюць. Кожны з іх не проста гуляе, ён – жыве. Апрануты ў адзенне таго часу, самастойна знаёмячыся з экспанатамі, гульнёвец даследуе музейныя рэчы і пакрысе складае біяграфію і творчы шлях паэта ў адзіную карціну. Адбываецца поўнае пагружэнне ў мастацка-вобразную прастору экспазіцыі. Праз гэтыя аспекты праходзяць ускосная адукацыя і вывучэнне матэрыялу. Самі экспанаты становяцца «персанажамі» сваіх праваднікоў. Але, на жаль, на сёння вялікай праблемай з'яўляецца абмежаванасць тактыльных кантактаў публікі з экспанатамі ці іх копіямі. Гэтая асаблівасць музейнага ладу перашкаджае атрымліваць чыстае ўражанне ад выдатна адбываючагася дзеяння.

Узаемадзеянне з музейным асяроддзем праз гульню дае магчымасць дакументальнаму матэрыялу ўспрымацца больш змястоўна, на новым якасным узроўні. Наведвальнік «акунаецца» не толькі ў інфармацыйны пласт, але і атрымлівае эмацыянальную разгрузку, што дапамагае больш паглыблена ўспрымаць інфармацыю, стымулюе цікавасць, акрамя таго, дазваляе выстройваць зносіны з гісторыяй не толькі на ўзроўні ведаў, але і праз пражыванне яе на ўласным вопыце.

Раз у год усе гэтыя формы аб'ядноўваюцца ў адно вялікае музейнае свята (паказ экспазіцый, тэатралізацыя, гульня, тэматычныя конкурсы, майстар-класы), знаёмяць публіку з гістарычнымі фактамі і дакументальнымі з'явамі, з'яўляючыся своеасаблівай прэзентацыяй музейных аб'ектаў.

Відовішчныя формы, інтэгруючыся з музейным асяроддзем, выконваюць неабходныя сацыяльна-культурныя і педагагічна-выхаваўчыя функцыі без нажыму з боку сухой дыдактыкі і класічных музейных метадаў, выклікаюць шчырую цікавасць наведвальнікаў, папулярызуюць музейную справу і патроху здымаюць клішэ – «сумны школьны адпачынак».

Відовішчна-тэатралізаванае афармленне музейнага асяроддзя прадугледжвае комплексны падыход да арганізацыі аб'ектна-прадметнай музейнай экспазіцыі і выкарыстання выразных сродкаў

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

тэатра. А музей патрабуе выкарыстання тэатралізаваных форм толькі ў арганічным адзінстве з прыродай і сутнасцю экспазіцыі. І гэта, з'яўляючыся адным з крытэрыяў гістарычнасці, становіцца творча апраўданым, раскрываецца праз узаемапранікненне мастацкага асэнсавання ў дакументальнасць матэрыялу. Такі падыход набліжае музейны дасуг да культурна-масавых мерапрыемстваў, адной з асаблівасцей якіх з'яўляецца дакументальная аснова мастацкага асэнсавання рэчаіснасці. Тэарэтычная база масавых мерапрыемстваў добра распрацавана і метадычна абгрунтавана, што дазваляе карыстацца яе здабыткамі для стварэння інтэграваных форм на базе музеяў.

Кожны час дыктуе свае ўмовы існавання, а кожны чалавек шукае цікавых уражанняў і яркіх эмоцый. Захаванне элементаў даўніны, перадача іх праз пакаленні, асвойванне новых сацыяльных функцый і служэнне папярэдне здабытым магчыма сёння, дзякуючы смелай інтэграцыі вiдовішчных методык у асяроддзе музейных экспанатаў, дазваляе стварыць неабходнае поле для працы і папулярызацыі музея ў грамадстве.

---

1. *Емельянов, А.* Зрелище: философские аспекты / А. Емельянов // Бренное и вечное: политические и социокультурные сценарии Б87 современного мифа: материалы Всерос. науч. конф. 11–12 окт. 2005 г. / НовГУ им. Ярослава Мудрого. – Великий Новгород, 2005. – С. 67–72.

2. *Зоркая, Н.* Зрелищные формы художественной культуры / Н. Зоркая. – М. : Знание, 1981. – С. 10.

3. *На пути* к музею XXI века / сост. и науч. ред. М. Т. Майстровская. – М., 1997.

4. *Нагорскі, Н. В.* Педагогічні та рекреаційні технології в сучасній індустрії дозвілля / Н. В. Нагорскі : матеріали Міжнар. наук.-практ. конф. – Київ, 2004.

5. *Поправко, Е. А.* Музееведение / Е. А. Поправко. – М. : ВГУЭС, 2005. – Гл. 3.4.2, 3.4.3.

6. *Ратнер, Я. В.* Эстетические проблемы зрелищных искусств / Я. В. Ратнер. – М. : Искусство, 1980. – С. 7.

7. *Социологические* чтения – 2012: материалы респ. науч.-практ. конф., 16–17 апр. 2012 г. ; под общ. ред. В. Н. Глины [Электронный ресурс]. – Гродно : ГрГУ, 2012. – С. 50.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*8. Тлумачальны* слоўнік беларускай літаратурнай мовы / пад рэд. М. Р. Судніка, М. Н. Крыўко. – 3-е выд. – Мінск : БелЭн, 2002. – С. 112.

*9. Юренева, Т. Ю.* Музееведение / Т. Ю. Юренева. – М., 2003. – Гл. : Музей как социокультурный институт.

*10. Ассоциация* музеев России – http://www.amr-museum.ru/.

*11. Все музеи* мира. – http://allmuseum.ru/.

*12. Сайт* Музеи России. – http://www.museum.ru/.

*13. Юренева, Т. Ю.* Музей в мировой культуре. – http : //weknowyou.ru/lib/Book-26-48.html.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ